Important Bird Area: Kaz`jany

© Д. Китель, В. Ивановский

Code: BY003

Central coordinates: 55°28' N 29°22' E

Location: Vitebskaya voblast: Polatsk region, Shumilina region

Area: 26625 ha

IBA Criteria: B2

National conservation status: ландшафтны заказнік рэспубліканскага значэння «Казьянскі»

International conservation status: ТВП рэгіянальнай значнасці, утворана ў 1998 годзе

Site description:

Заказнік уяўляе сабой складаны мазаічны комплекс верхавых балот, лясоў, заліўных лугоў, азёр і сельскагаспадарчых зямель. Тэрыторыя характарызуецца разнастайнасцю і кантрастнасцю экалагічных умоў, наяўнасцю ўнікальных прыродных комплексаў: буйных масіваў верхавых і пераходных балот (займаюць значную частку тэрыторыі), адкрытых нізінных балот, шматлікіх рэк і азёр, пясчаных дзюн; а таксама малапарушаных лясоў, у тым ліку і фрагментарных дубраў.

Рачная сетка гэтага рэгіёна належыць да басейна ракі Заходняя Дзвіна.

Галоўны яе прыток – рака Обаль – працякае ўздоўж усходняй і паўднёвай межаў заказніка. На тэрыторыі заказніка Обаль прымае два правыя прытокі – рэкі Цэніца і Глыбачка. Поймы рэк слабавыражаныя, рэчышчы – звілістыя. Істотная роля ў фарміраванні ландшафтаў заказніка належыць азёрам, найбольш буйныя з іх – Мошна, Расалай і Красамай. Амаль усе яны – дыстрафіруючыя, мелкаводныя, маюць нізкія забалочаныя берагі і зарастаюць воднай расліннасцю.

Сельскагаспадарчыя землі (ралля, сенакосы, і выганы) складаюць 3% ад агульнай плошчы тэрыторыі. Паколькі ў заказніку пераважаюць забалочаныя лясы, лесакарыстанне тут абмежаванае. Тэрыторыя заказніка з’яўляецца традыцыйным месцам збору грыбоў і ягад мясцовым насельніцтвам.

Habitats:

Балоты верхавыя і пераходныя – 18%, лясы – 78,8% (у тым ліку: бярэзнікі – 40,7%, саснякі – 31,8%; ельнікі – 12,5%, чорнаальшаннікі – 9,2%, шэраальшаннікі – 3%, асіннікі – 2,6%), азёры – 1%, іншыя землі – 2,2%.

Birds:

На гнездаванні ў заказніку адзначана 175 відаў птушак, 44 віды занесены ў Чырвоную кнігу Беларусі.

ТВП Казьяны мае рэгіянальнае значэнне для захавання шэрагу відаў: чорны бусел *Ciconia nigra*, палявы лунь *Circus cyaneus,* скапа *Pandion haliaetus,* шэры журавель *Grus grus*, вялікі кулён *Numenius arquata.* Акрамя таго, Казьяны маюць вялікае значэнне для птушак верхавых і пераходных балот. Тут гняздяцца сокал-шулёнак *Falco vespertinus,* пардва *Lagopus lagopus,* залацістая сеўка *Pluvialis apricaria,* сярэдні кулён *Numenius phaeopus,* кулік-селянец *Tringa nebularia.* Колькасць звычайнага гогаля *Bucephalaclangula* на гнездаванні дасягае 30-40 пар.

Other animal groups:

Усяго адзначана 32 віда млекакормячых, 9 відаў амфібій, 5 відаў рэптылій.

Найбольш шматлікімі прадстаўнікамі млекакормячых, за выключэннем мышападобных грызуноў, з’яўляюцца заяц-бяляк, заяц-русак, андатра, бобр. Вельмі рэпрэзентатыўна на тэрыторыі ТВП прадстаўлена група драпежных звяроў.

Занесеныя ў Чырвоную кнігу віды млекакормячых фарміруюць тут даволі

ўстойлівыя групоўкі: барсук *Meles meles* (10 пасяленняў), рысь *Felis linx* (5-8) і буры мядзведзь *Ursus arctos* (3-5 пасяленняў).

Populations of IBA trigger species:

Species	Season	Quality of estimate	Period	Quality of estimate	Trends	IBA criteria
Willow grouse *Lagopus lagopus*	B	10-20 breeding pairs	2000-2010	Medium		
Black-throated diver *Gavia arctica*	B	1-2 breeding pairs	2000-2010	Medium		
Bittern *Botaurus stellaris*	B	5-8 males only	2000-2010	Medium		
Black stork *Ciconia nigra*	B	8-10 breeding pairs	2000-2010	Medium		B2
White-tailed eagle *Haliaeetus albicilla*	B	1 breeding pairs	2000-2010	Good		
Short-toed eagle *Circaetus gallicus*	B	3 breeding pairs	2000-2010	Good		
Hen harrier *Circus cyaneus*	B	5 breeding pairs	2000-2010	Medium		B2
Lesser spotted eagle *Aquila pomarina*	B	8-12 breeding pairs	2000-2010	Medium		
Golden eagle *Aquila chrysaetos*	N	+	2000-2010	Poor		
Osprey *Pandion haliaetus*	B	3 breeding pairs	2000-2010	Good		

Species	Season	Quality of estimate	Period	Quality of estimate	Trends	IBA criteria
Kestrel *Falco tinnunculus*	B	15-20 breeding pairs	2000-2010	Medium		
Red-footed falcon *Falco vespertinus*	P	+	2000-2010	Poor		
Merlin *Falco columbarius*	B	6-8 breeding pairs	2000-2010	Medium		
Hobby *Falco subbuteo*	B	8-10 breeding pairs	2000-2010	Medium		
Crane *Grus grus*	B	20-25 breeding pairs	2000-2010	Medium		B2
Golden plover *Pluvialis apricaria*	B	30-50 breeding pairs	2000-2010	Medium		
Whimbrel *Numenius phaeopus*	B	10-15 breeding pairs	2000-2010	Medium		
Curlew *Numenius arquata*	B	10-20 breeding pairs	2000-2010	Medium		B2
Greenshank *Tringa nebularia*	B	20-30 breeding pairs	2000-2010	Medium		
Ural owl *Strix uralensis*	B	4-5 breeding pairs	2000-2010	Medium		
Graet grey owl *Strix nebulosa*	B	1 breeding pairs	2000-2010	Poor		

Species	Season	Quality of estimate	Period	Quality of estimate	Trends	IBA criteria
Short-eared owl *Asio flammeus*	B	3-6 breeding pairs	2000-2010	Medium		

Other biodiversity:

Расліны: сфагнум Ліндберга*Sphagnumlindbergii, Менегацция продырявленная Menegazziapertusa,* баранец звычайны*Huperziaselago,* бяроза карлікавая*Betulanana,* рагулькі высокія*Delphiniumelatum,* касач сібірскі*Irissibirica*, ядрушка даўгарогая *Gymnadeniaconopsea,* званочак шыракалісты*Campanulalatifolia,* пярэсна еўрапейская*Trolliuseuropaeus,* ладдзян трохнадрэзаны*Corallorhizatrifida,* лінея паўночная*Linnaeaborealis,* цыбуля мядзведжая*Alliumursinum,* луннік ажываючы *Lunariarediviva,* марошка прысадзістая*Rubuschamaemorus,* асака малакветкавая *Carexpauciflora,* асака заліўная*Carexpaupercula,* пустапялёснік зялёны*Coeloglossum viride,* расіца прамежкавая*Droseraintermedia,* тайнік яйцападобны*Listeraovata,* шпажнік чарапіцавы*Gladiolusimbricatus.*

Threats:

- Асушэнне прылягаючых тэрыторый і выраўноўванне малых рэк (каля 60% рэчышчаў малых рэк, якія працякаюць па тэрыторыі заказніка, каналізавана) выклікалі парушэнні гідралагічнага рэжыму балота.
- Лакальная здабыча торфу ў паўднёвай частцы тарфянога масіву Обаль-2.
- Выпальванне расліннасці аказвае надзвычай шкодны ўплыў на флору і фауну заказніка, асабліва ва ўмовах сухой вясны.
- Высечка карэнных лясоў – ельнікаў, а часам і альшанікаў, суправаджаецца рэзкім зніжэннем біялагічнай разнастайнасці.
- Прамысловае рыбалоўства, якое ажыццяўляецца Віцебскім рыбгасам на адным з самых маляўнічых азёр – Мошна, можа стаць прычынай скарачэння яго рыбных запасаў.
- Раслінныя сукцэсіі. На нізінных балотах адкрытыя ўчасткі зарастаюць хмызняком, што звязана, у асноўным, са змяншэннем сенакашэння.

Recommendations for the conservation:

Для больш эфектыўнай аховы і рацыянальнага выкарыстання біялагічнай разнастайнасці неабходна распрацаваць план кіравання заказнікам міжнароднага значэння.

У першую чаргу неабходна вырашыць наступныя найбольш важныя пытанні:

- аптымізацыя гідралагічнага рэжыму;
- распрацоўка рэжымаў землекарыстання (сельская, лясная і рыбная гаспадаркі, паляванне);
- аднаўленне балот на выпрацаваных тарфяніках.

References:

Асабістыя паведамленні: Іваноўскі У.В.

Скарбы прыроды Беларусі. – Мн.: Беларусь, 2005. – 215 с. (Інфармацыю падрыхтавалі: Вынаеў Г.В., Іваноўскі У.В., Кузьменка У.Я.)

Научное и технико-экономическое обоснование реорганизации заказника «Козьянский», Минск, 1998 г.

Authors : Іваноўскі У.В., Левы С.В.

---

* *Использование размещенной здесь неопубликованной информации для научных публикаций без письменного соглашения ее авторов запрещено. В случае использования части контента или страницы целиком на других интернет-ресурсах, обязательна ссылка на авторов и сайт iba.ptushki.org*